***Ганна Барвенава***

# АСНОЎНЫЯ ПАМЫЛКІ РЭЖЫСЁРАЎ СУЧАСНЫХ СВЯТАЎ У ВЫКАРЫСТАННІ НАРОДНАГА КАСЦЮМА

На працягу другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзяў шмат намаганняў этнографаў, фальклАрыстаў, мастацтвазнаўцаў, рэжысёраў, мастакоў, сцэнографаў нададзена вывучэнню традыцыйнага беларускага касцюма, прапановам граматнай падачы яго ў фальклорным калектыве, сцэнаграфіі сучаснага свята [1; 4; 5; 6; 7; 8]. Аднак, нярэдка на святах, у тым ліку дзяржаўных, з'яўляюцца акцёры (выканаўцы, калектывы) ў некарэктных строях, якія не адпавядаюць тэматыцы свята, полава-узроставай градацыі, раяніраванню і інш. Таму ў артыкуле будуць прааналізаваны асноўныя памылкі, якія дапускаюцца ў сучаснай святочнай культуры Беларусі пры стварэнні мастацкага вобраза праз выкарыстанне народнага касцюма.



*Малюнак 1* – Святочныя ўборы дзяўчат і маладух. Чэрск, Брэсцкі р-н, 1910 г. [8, іл. 60]



*Малюнак 2* – Строй жанчын і дзяцей. В. Дражна Бабруйскага павету, пач. XX ст. Фотаздымак І. Сербава [8, іл. 308]



*Малюнак 3* – Строй мяшчанак. Давыд-Гарадок, канец XIX ст. [8, іл. 222]

Для таго, каб выявіць памылкі ў выкарыстанні набыткаў традыцыйнага касцюма беларусаў ў сучасных святах, варта звярнуцца да базіса святочнага календара. Традыцыйны касцюм беларусаў быў падпарадкаваны двум асноўным цыклам: каляндарна-абрадавым святам; сямейна-абрадаваму комплексу свят. Абодва цыклы прадугледжвалі стройную, прадуманую сістэму перадачы каштоўнасцяў грамадства, іерархічных ўзаемаадносін ў сям'і, вёсцы, полава-узроставую і маёмасную дыферэнцыяцыю ўдзельнікаў святочных дзей (мал. 1-3). Сістэму каштоўнасцяў на працягу тысячагоддзя ўклалі ў сімволіку і семантыку кампанентаў традыцыйнага строю, у вызначаныя для розных узростаў кампаненты, каларыстычную гаму, арнаментыку касцюма, рэгламентацыю выкарыстання кампанентаў строю ў святочных дзеях, падкрэсліванне праз змены кампанентаў строю падчас святочнай дзеі змены статуса ўладальніка касцюма (напрыклад, вясельны абрад) [4; 8] (мал. 4-6).







РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Малюнак 4* – Традыцыйны беларускі строй дзяўчыны (Падарэссе, Старадарожскі р-н., пач. XX ст.) [8, іл. 325]

*Малюнак 5* – Вясельны строй (Радстава, Драгічынскі р-н, сяр. XX ст.) [8, іл. 98]

*Малюнак 6* – Строй жанчыны (Яўсімавічы, Кобрынскі р-н, 1920). Фотаздымкі М. Раманюка [8, іл. 7]

Кульмінацыяй асабістага жыцця чалавека ў традыцыйнай беларускай культуры было вяселле, адпаведна, вясельны касцюм быў вяршыняй майстэрства ўладальніцы, гонарам яе і яе радзіны, расказам пра працавітасць, майстэрства, густ будучай маці, гаспадыні (мал. 5). Жаночы вясельны касцюм апраналі пасля вяселля максімум некалькі разоў, а пасля захоўвалі ў куфры на шлях у вечнасць, таму менавіта вясельныя касцюмы захоўваюцца ў выдатным стане ў музеях Беларусі [7; 8]. Каб дасягнуць трыумфу традыцыйнага строю на вяселлі трэба было прайсці папярэднія этапы сямейна-абрадавага цыклу.

Н (Хр)__1 год____________Полаваспеласць_____Вяселле________________________П

Падчас нараджэння чалавека ў традыцыйнай культуры выконваліся многія рытуалы, звязаныя з кампанентамі бацькоўскага адзення, навародка сустракалі (загортвалі) белым без дэкору, новым палатном, як сімвалам новага, светлага жыцця [2; 5]. Скрутак перавязвалі чырвонай скручанай ніткай (сучасная аналогія блакітная і ружовая атласныя стужкі; заўважым, і сёння ніхто не бярэ арнаментаваную). Падчас хрышчэння ў хрысціянскім храме таксама выкарыстоўваецца белая тканіна, белы кампанент адзення без прывязкі да ўзросту ахрышчанага. Да года дзеці незалежна ад пола былі апрануты ў кашулькі, што дазваляла падтрымліваць гігіену, старэйшым дзецям пазнаёміцца з асаблівасцямі чалавечага цела. У годзік дзяцей, зноў такі незалежна ад пола, галілі ў гігіенічных мэтах. Новае адзенне дарылі, пачынаючы са святкавання першага дня народзінаў, а штодзённа апраналі ў адзенне, пашытае з старога бацькоўскага (мяккасць і эканомія). З дзяцінства дзіцяці прывучвалі да абавязкаў па гаспадарцы, дзяўчынак каля маці, хлопчыкаў каля таты, праз працэс назірання, выканання пасільных даручэнняў, абучэння (пляценне паясоў; падача інструмента, убіванне цвіка). Так паступова дзяўчына павінна была навучыцца вырабляць ніткі, плесці паясы, ткаць. Першая тканіна, якую самастойна дзяўчына выткала на кроснах – фартух, маркіраваў яе полаваспеласць. Завязванне фартуха мамай (бабуляй, хроснай) з’яўлялася ў традыцыйнай культуры ініцыяцыяй, пераходам ад дзяцінства да дзявоцтва (фізічна здольная нараджаць, кіраваць складанымі і цяжкімі кроснамі, гаспадаркай). З гэтага часу дзяўчыне было дазволена хадзіць на вячоркі, выбіраць мужа, рыхтавацца да вяселля. Дзяўчына павінна была вырабіць вясельны строй (выткала яшчэ лепшы – паклала ў куфар, папярэдні апранула на вячоркі для дэманстрацыі сваёй прыгажосці і майстэрства), ручнікі, прыданае, падарункі будучым сваякам (і сёння на вяселлі маладая адорвае тканінай блізкіх сваякоў мужа). Дзяўчына ў строі, падрыхтаваным да вяселля, або пасля выхаду замуж ў вясельным строі ніколі не ішла на Купалле, Каляды, Гуканне вясны, бо столькі сіл, каштоўнага часу было аддадзена на стварэнне кожнага кампанента касцюма, столькі мараў-жаданняў было ўкладзена ў ніткі, арнамент, што катацца па траве, скакаць праз вогнішча, хадзіць па снезе, псаваць дарагую рэч яна сабе дазволіць не магла. Таму ў багатым вышываным строі дзяўчаты і маладухі хадзілі толькі на вячоркі, сямейна-абрадавая святы, яго бераглі як рэліквію. Вясельны строй – гэта кульмінацыя творчасці жанчыны, пасля вяселля яе час, майстэрства аддадзены мужу, дзецям і больш ніколі сабе. Калі жанчына другі, трэці раз выходзіла замуж яе строй не быў такі ж багаты, насычаны колерамі і знакамі як вясельны касцюм-сімвал пераходу ад дзявоцтва да замужжа. Варта сказаць, што заручальныя пярсцёнкі не неслі такой глыбокай сімволікі ў традыцыйнай беларускай культуры як касцюм, таму іх не было ўвогуле або пасля вяселля іх загортвалі ў хусцінкі і клалі разам з касцюмам у куфар. Наступны этап ў выкарыстанні сімвалічнага традыцыйнага строю толькі пахавальны, таму, рыхтуючыся да родаў, жанчына складала сабе строй у вечнасць, пасля толькі мяняла яго кампаненты (да прыкладу, чаравічкі стала насіць, іншыя набыла і паклала ў камплект). У беларусаў нярэдкія выпадкі, калі шлюбнае адзенне выступала ў якасці пахавальнага ўбору.

Мужчынскія вясельныя строі не мелі такога глыбокага сімвалізму як жаночыя, таму кашулю, вытканую маці або сястрою, порткі, боты насілі і зношвалі. Для мужчыны на вячорках трэба было прадэманстраваць дзяўчатам сваё ўменне пабудаваць дом, зрабіць лыжку, зэдлік. Адпаведна, ў традыцыйнай культуры хлопец вучыўся з дзяцінства побач з татам (дзядзькам, хросным) майстраваць, выконваць усё неабходнае па гаспадарцы, а дзяўчатам сваё майстэрства даказваў багата аздобленай прасніцай – дошчачкай, да якой прымацоўвалася кудзеля. Таму на вячорках была своеасаблівая гульня-дэманстрацыя ўмельства: дзяўчына прыйшла ў самаробным строі з кудзеляй, а кудзелю няма як прымацаваць, хлопец упадабанай дзяўчыне прапануе самастойна выробленую прасніцу (мал. 7). Падарункам дзяўчыне даказваецца, што калі хлопец змог выразаць сонейка, дрэвы, чароўных птушак на маленькай дошчачцы, то дом ён відавочна збудуе, тым больш зробіць калыску. А калі падарунак прыняты, кудзеля прымацавана на прасніцу – выказана павага, сімпатыя адно да аднаго, магчыма, будуць святкаваць вяселле (мал. 8).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Малюнак 7* – Дзяўчына з праселкай і верацяном. Шапчыцы, Рагачоўскі р-н, 1903 г. [8, іл. 242]



*Малюнак 8* – Вясельныя строі. Воўчын, Камянецкі р-н, пач. ХХ ст. [8, іл. 421]

Каляндарна-абрадавыя святы маюць сваю сістэму выкарыстання традыцыйнага касцюма або яго кампанентаў, магіі адзення (голага цела). Рытуальныя акцыі з кампанентамі адзення прымяркоўваліся найперш да святаў, што займалі канцавыя пункты цэнтральных восяў каляндарнага кола: Каляды і Купала, Масленка/Вялікдзень і Дзяды/Узвіжанне. Вельмі коратка азначым асаблівасці касцюмаў (пераапранання) удзельнікаў асноўных каляндарных свят. На Каляды ў маскіраваным калядным гурце ўдзельнічала пераважна полаваспелая моладзь, за якой даглядаў механош (старэйшы за удзельнікаў), пасля ў хаце гаспадыня (сталая жанчына, якая дазіравала пачастункі, назірала) (мал. 9). Калядпай Казой быў хлопец, бо традыцыйная культура не магла дазволіць дзяўчыне, будучай маці валяцца па снезе (падлозе). Пераапраналіся ў калядных персанажаў хлопцы, дзяўчаты былі ў спеўным гурце, а асноўнымі ўмовамі пераапранання і маскіравання былі выразнасць сімвалічных персанажаў, гумар, цеплыня вопраткі. Ад Калядаў ішоў час вячорак, вяселляў, адпаведна дэманстрацыі строяў, ўмення ткаць і працаваць з дрэвам. А тыя, хто не знайшоў за гэты перыяд сабе пару, станавіліся героямі вясновых рытуалаў: залезці на слуп, калодка, пазначэнне веснічкаў, катанне на баране і г.д., якія павінны былі падштурхнуць да далейшых пошукаў абранніцы, дэманстравалі прыгажосць, фізічную моц, спеласць хлопца і дзяўчыны. Дзеці, моладзь, як асноўныя ўдзельнікі вясновых свят, апраналіся ў чыстае, пераважна адзін кампанент строю павінен быў быць новы (адраджэнне, абнаўленне), напрыклад, кашуля, вытканая за зіму, хустка, боты, набытыя на вясенніх кірмашах (мал. 10).

Купалле прадугледжвала пакланенне прыродзе, прыгажосці чалавека, адпаведна, галоўныя ўдзельнікі абрадаў, гульняў былі больш распранутыя чым апранутыя [3]. Немагчыма сабе ўявіць, каб дзяўчына ўсю зіму вырабляла строй і пайшла ў ім на Купалле скакаць праз вогнішча, катацца па расе, шукаць Папараць кветку. Кашуля, і не новая, была асноўным адзеннем на Купаллі, паясы развязваліся, станавіліся элементам купальскіх гульняў. Дзяўчыну маглі ўпрыгожыць толькі галінкамі, кветкамі. Пакланенне магіі, моцы чалавечага цела, плоднасці ўваходзіла ў сістэму традыцыйных каштоўнасцяў. У архаічнай свядомасці аголенае цела мела прадукавальнае значэнне. Выразна гэта тлумачыць пазасвяточная культура: практыка пасеву зерня голым або, дакладней кажучы, без нагавіцаў. Відавочна, такія дзеянні, як прынос на поле зерня ў старых нагавіцах ці аб'езд поля на кані мужчынам зусім без іх, мелі асновай сімволіку пасеву як апладнення зямлі. На Беларусі распаўсюджаны звычай цягаць нагавіцы па агурках, «каб завязі болей было». Апладняльная скіраванасць гэтага дзеяння не выклікае сумневу. Наагул вырошчванне агуркоў у сельскагаспадарчай магіі ўстойліва звязанае з мужчынскім пачаткам (прадпісанні сеяць агуркі тады, калі муж мыецца ў лазні, г.зн. голы, ці нават просьба да яго пабегаць голым па лёхах (г.Лепель ад Пшонка У.Я.), параўн.: «Расціце, агурочкі, як мужчынскія ...» (в.Люкжана Ушацкага р-на) [2]. Восеньскія святы (Зажынкі, Дажынкі, Дзяды) мяняюць узрост асноўных удзельнікаў – старшыя ў сям'і, сталыя людзі. Адпаведна адзенне ўдзельнікаў абрадаў мае іншую маркіроўку: светлае зручнае адзенне, хустка для працы і абрадаў на полі; каптур, намітка, дарагая набытая, падораная хустка, расшытая камізэлька, модныя чаравікі, «гарадскія» кохта, пінжак, паліто на Дажынкі, Дзяды. Багам, Дзядам дэманструецца лад у сям'і, заможнасць.

У традыцыйным календары беларусаў вылучаецца некалькі пунктаў, калі спальванне кампанентаў адзення было абрадава неабходным і самастойным структурным звяном свята. Найперш на Купаллі: «на Купалу патопкі калісь насілі, на палку наніжым і пошлі на поле, нясом патопкі на выган, куфайку на чучыла напянім, здзелаім чучыла, усё ў агонь, папалім» [2, сп. 53, 92], на Купалу палілі ворах лапцей і крычалі: «Цяпер Купайло, заўтра Шан, Чорт хапае ведзьму цераз баркан» [2, сп. 220, 189]. Паказальнае апісанне купальскага абраду, зробленае ў сярэдзіне ХХ ст.: «збіраліся па-дзівацку ўбраныя ўдовы і маладзіцы: іх вопратка была старой і з прарэхамі, валасы абвешаны крапівай і распушчаны, кругом яны былі абвешаны лазовымі лапцямі-патопкамі» [2,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

сп. 35, 42]. Згаданая рытуальная акцыя змяшчае ў сваім семантычным полі некалькі значэнняў: гэта і матыў пазбаўлення «старызны» ва ўсіх сэнсах у пераломны момант года, гэта і абрадавае выправоджванне нячыстай сілы, арганічнае для Купалля, дзе лапаць, старыя рэчы выступаюць абавязковым атрыбутам. Не выключаныя і матывы ахвярапрынашэння продкам, натуральныя для гэтай крытычнай у сістэме года часіне, і нават перапыненне прысутнасці продкаў сярод жывых. Старызну палілі на Масленіцу: «Ідэ зіма до тучы, бэрэ постолы і ганучы» (в.Опаль Іванаўскага р-на) [2]. Як даказвае Т. Валодзіна, сімволіка старых рэчаў актуалізавалася ў маргінальны, адкрыты іншасвету каляндарны час.

На вялікі жаль, нягледзячы на відавочнае багацце беларускага вясковага строю, тысячагадовай сімволікі і семантыкі выкарыстання строю і яго кампанентаў у сямейна-абрадавых і каляндарна-абрадавых святах, магчымасці майстроў і творчых майстэрняў (УП «Скарбніца» вырабляе беларускія народныя строі вышэйшай якасці і ідэальнага падабенства з арыгіналам) рэжысёры, сцэнографы сучасных свят дапускаюць грубыя памылкі, якія прыводзяць да зніштажэння структуры традыцыйнай святочнай культуры, яе звыш спрашчэння, зрэшты, агіднага стаўлення гледачоў да фальклору, беларускай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Малюнак 9* – Калядны гурт. Заходы, Шклоўскі р-н, 1904 г. [8, іл. 251]



*Малюнак 10* – Моладзь у святочных летніх уборах. Лагішын, Пінскі р-н, 1930-я гг. [8, іл. 126]



*Малюнак 11* – Памылковае выкарыстанне на святах адзення, не характэрнага традыцыйнай беларускай культуры. Рэспубліканскія Дажынкі-2012

Асноўныя грубыя памылкі, якія сёння назіраюцца ў сучасных святах:

1. Выкарыстанне «вясельнага» адзення падчас каляндарна-абрадавых свят;
2. Выкарыстанне кампанентаў адзення, якія не ўласцівы пэўнай ўзроставай групе ў беларускай традыцыйнай культуры (скіндачкі, вянкі на сталых жанчынах, фартушкі ў касцюме дзяцей і т.п.). Не правільны пол і ўзрост галоўных удзельнікаў (персанажаў) каляндарна-абрадавага свята;
3. Рэдкая прысутнасць рэгіянальнага традыцыйнага беларускага адзення, абрадавых дзеянняў з кампанентамі строю, уласцівых традыцыйнай беларускай святочнай культуры;
4. Не граматнае выкарыстанне сімволікі кампанентаў традыцыйнага беларускага касцюма, традыцыйнай магіі цела ў каляндарна-абрадавых святах;

5. Выкарыстанне сцэнічнага адзення, створанага ў 60-80-я гады з поўным парушэннем традыцыйных кампанентаў, з звыш стылізаваным, узбуйненым арнаментам, адсутнасцю рэгіянальнай прыналежнасці і т.п., не характэрнага традыцыйнай беларускай культуры (мал. 11).

**Спіс літаратуры:**


1. Беларускае народнае адзенне. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 96 с.
2. Валодзіна, Т.В. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т.В. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 1999. – 167 с.
3. Гуд, П.А. Беларускі купальскі комплекс і семантыка абрадавых дзей / П.А. Гуд. – Мінск : Тэхнапрынт, 1999. – 221 с.
4. Кацар, М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М.С. Кацар ; навук. рэд. Я.М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1996. – 208 с.
5. Крук, І.І. Сімволіка беларускай народнай культуры / І.І. Крук. – Мінск : Ураджай, 2001. – 350 с.
6. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А. Лобачевская, З.И. Зимина. – Минск : Беларус. навука, 2009. – 279 с.
7. Музей старажытнабеларускай культуры. – Мінск : Беларусь, 2004. – 283 с.
8. Раманюк, М.Ф. Беларускае народнае адзенне / М.Ф. Раманюк. – Мінск : Беларусь, 1981. – 473 с.
9. Скарбніца [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://skarbnica.by. – Дата доступу : 12.04.2013.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ